**І. Б. Лапцёнак,**
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт, дырэктар ІПКіПК*

# ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ ДАРОСЛЫХ У СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ: ІНТЭГРАЦЫЙНЫ ПАДЫХОД І ПАШЫРЭННЕ ІНАВАЦЫЙНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ

Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2030 г. вызначае, што «ў фарміраванні інавацыйнай эканомікі і яе канкурэнтнага асяроддзя сістэма адукацыі павінна забяспечыць адпаведнасць атрыманых ведаў і навыкаў хутказменлівым патрабаванням з боку грамадства і эканомікі, тэхнікі і тэхналогій, развіццю асабістай ініцыятывы і адаптаванасці чалавека, дзякуючы якім пашыраюцца яго магчымасці генерыраваць ідэі і інавацыі» [2]. Шырокія магчымасці для гэтага адкрывае дадатковая адукацыя дарослых, асноўныя вектары функцыянавання якой распрацаваны на аснове стратэгій і рэкамендацый аўтарытэтных міжнародных арганізацый, камісій і форумаў: Міжнароднай канферэнцыі пад эгідай ААН па праблемах адукацыі дарослых (Гамбург, 1997 г.) і прынятай на ёй дэкларацыі аб навучанні дарослых, Міжпарламенцкай асамблеі СНД «Аб адукацыі дарослых» (1997) і прынятага ў яе рамках аднайменнага мадэльнага закона, Мемарандума бесперапыннай адукацыі (2000), Міжнароднай канферэнцыі па праблемах адукацыі дарослых (Дамаск, 2000 г.) і прынятага ёю «Прызыву да дзеянняў у сферы пісьменнасці і адукацыі дарослых для ўсіх» і інш. У Выніковай дэкларацыі VI Міжнароднай канферэнцыі ЮНЕСКА «CONFINTEA VI» падкрэсліваецца, што дадатковая адукацыя дарослых выконвае «найважную ролю ў пошуку рашэнняў сучасных праблем у галіне культуры, эканомікі, палітыкі і грамадскіх адносін», з'яўляючыся ключавым кампанентам цэласнай сістэмы навучання і адукацыі на працягу ўсяго жыцця [1, с. 106].

Сёння сусветная супольнасць разглядае дадатковую адукацыю дарослых (далей – ДАД) у кантэксце бесперапыннай адукацыі як найважнейшую частку інавацыйнага развіцця, механізму генерыравання і трансферу новых ведаў. Паводле ацэнак экспертаў Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

развіцця, з улікам развіцця дэмаграфічнай сітуацыі ў развітых краінах, да 2050 г. пераважная частка адукацыйных практык у фармальнай сістэме адукацыі і за яе межамі будзе звязана з дарослым насельніцтвам.

Для забеспячэння комплекснасці і адзінства сувязі даследчай, праектнай і вытворчай дзейнасці ў фарміраванні і развіцці высокакваліфікаваных кампетэнцый у Расіі на дзяржаўным узроўні пастаўлена пытанне аб неабходнасці стварэння цэнтраў кампетэнцый, мэтай дзейнасці якіх вызначана «кадравая, кансультацыйная або сэрвісная падтрымка прафесійных праектаў інавацыйнага навучання і сацыяльна-эканамічнага развіцця, забеспячэнне сферы адукацыі і іншых галін эканомікі неабходнай навуковай, інфармацыйнай, прававой і метадычнай падтрымкай у частцы выканання задач, звязаных з назапашваннем і трансферам новых ведаў і вопыту» [1, с. 262]. Асноўнымі напрамкамі функцыянавання цэнтраў кампетэнцый з’яўляюцца збор перадавога вопыту, выяўленне і сістэматызацыя эфектыўных практык, абслугоўванне разнастайных праектаў і ініцыятыў, звязаных з кіраваннем ведамі, фарміраванне базы навуковых прац і інш.

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь распрацаваны праграмныя дакументы, накіраваныя на развіццё сістэмы дадатковай адукацыі дарослых з улікам пашырэння сферы прымянення новых падыходаў, у тым ліку інтэграцыйнага падыходу і інавацыйнай кампетэнтнасці. *Канцэпцыя развіцця педагагічнай адукацыі на 2015–2020 гг.* вызначае прыярытэтныя напрамкі ўдасканалення сістэмы ў сучасных сацыяльна-эканамічных умовах і прагназуе магчымасці павелічэння яе сацыяльнай эфектыўнасці. Для павышэння якасці адукацыйнага працэсу прадугледжана выкарыстанне сучасных інфармацыйных і інавацыйных педагагічных тэхналогій, пашырэнне праблемна-даследчай базы і інтэграцыя вучэбна-навукова-інавацыйнага патэнцыялу адукацыйных і навукова-метадычных устаноў, пераход на кластарную мадэль развіцця. У *Канцэпцыі інфарматызацыі сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г.* вызначаны ў ліку прыярытэтных напрамкаў: распрацоўка электронных адукацыйных рэсурсаў; забеспячэнне сеткавага ўзаемадзеяння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу; распаўсюджванне дыстанцыйнай формы атрымання адукацыі. *Сёмай падпраграмай*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*«Развіццё сістэмы дадатковай адукацыі дарослых» Дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016–2020 гг.* прадугледжваецца вырашэнне задач па забеспячэнню разнастайнасці, варыятыўнасці і гібкасці вучэбных планаў і вучэбных праграм; прымяненню сучасных адукацыйных тэхналогій, іх аператыўнага водгуку на запатрабаванні рынку адукацыйных паслуг.

На сённяшні дзень *адукацыйныя праграмы ДАД сферы культуры рэспубліканскага ўзроўню* рэалізуюцца Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (далей – БДУКМ), а таксама на факультэтах павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ўстаноў адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» і «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў». Ва ўсіх названых установах ажыццяўляецца адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў; павышэнне кваліфікацыі – у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (далей – ІПКіПК) і на факультэце Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту павышэнне кваліфікацыі праводзіцца ў ІПКіПК і на факультэце Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, а перападрыхтоўка – толькі ў ІПКіПК. Штогод павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў ім праходзяць больш за 40 % ад колькасці кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія засвоілі адукацыйныя праграмы ДАД ва ўстановах адукацыі сферы культуры: такія катэгорыі работнікаў, як кіраўнікі і спецыялісты ўпраўленняў культуры, клубаў, палацаў і дамоў культуры, метадычных цэнтраў народнай творчасці, бібліятэк, музеяў, арганізацый кінавідэапракату, кіраўнікі і педагагічныя работнікі дзіцячых школ мастацтваў, выкладчыкі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, кіраўнікі тэатральна-відовішчных устаноў і інш.

Значны элемент ДАД у ІПКіПК – *інтэграцыя з базамі практыкі.* Практыка-арыентаванае навучанне прадугледжвае наяўнасць адметных пляцовак, створаных як ва ўстанове адукацыі, так і ў арганізацыях галіны пры садзеянні ўстановы адукацыі, з мэтай вырашэння рэальных задач практычнай дзейнасці. Дзякуючы выяўленню і выкарыстанню ў адукацыйным працэсе лепшых практык пашыраецца інавацыйная кампетэнтнасць кіраўнікоў і спецыялістаў сферы культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Саарганізатарамі ІПКіПК у рэалізацыі інтэграцыйнага навучання з'яўляюцца як унутраныя партнёры (кафедры БДУКМ, галерэя «Ўніверсітэт культуры», аддзел інфармацыйна-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых ІПКіПК), так і знешнія партнёры (базы практык у арганізацыях, па напрамках культурнай дзейнасці). У мэтах павышэння якасці адукацыі распрацаваны пералік базавых пляцовак для правядзення выязных аўдыторных заняткаў для слухачоў, у які ўключаны 57 устаноў культуры і адукацыі. На іх базе праводзяцца практычныя заняткі, майстар-класы, трэнінгі, заняткі са слухачамі па абмену вопытам. Практычны кампанент, зафіксаваны ў адукацыйных праграмах ДАД ІПКіПК, складае больш за 70 % ад агульнай колькасці вучэбных гадзін. Колькасць заняткаў для груп павышэння кваліфікацыі на выездзе, як правіла, складае каля 50 % ад агульнай колькасці вучэбных гадзін, для некаторых катэгорый слухачоў пры засваенні пэўных праграм – 60–80 %.

Важным фактарам паспяховага ўкаранення інтэграцыйнага падыходу і пашырэння інавацыйнай кампетэнтнасці з'яўляецца прафесійная кампетэнтнасць прафесарска-выкладчыцкага складу, дзейнасць кафедры па *арганізацыі навуковых і творчых школ, лабараторый, эксперыментальных пляцовак, спецыялізаваных аўдыторый, філіялаў*. З мэтай профільнай падтрымкі і стварэння дадатковых магчымасцей для ўдасканалення майстэрства спецыялістаў сферы культуры ў ІПКіПК у 2016 г. была адкрыта этналабараторыя. У аснову прадметнай часткі яе мабільнай экспазіцыі пакладзены калекцыі народных інструментаў, побытавых рэчаў і строяў больш чым з 15 краін свету. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў слухачы засвойваюць змест адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі, навучальных курсаў, перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «культурна-адпачынкавая дзейнасць».

Вектары распрацоўкі і ўкаранення зместу праграм ДАД у сферы культуры вызначаны *перспектыўнымі напрамкамі развіцця культуры*, сярод якіх інтэграцыя беларускай культуры ў сусветную; стварэнне канкурэнтаздольнага культурнага прадукту і яго сістэмная рэпрэзентацыя; распрацоўка стандартаў якасці паслуг у сферы культуры; захаванне нацыянальна-культурнай самабытнасці і традыцый; усямерная падтрымка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таленавітай моладзі ў рэалізацыі новых ідэй і творчых праектаў [2, с. 31–32].

Асновай для ўдасканалення сістэмы ДАД павінна стаць *умацаванне інтэграцыі навукі, адукацыі і практычнай дзейнасці арганізацый галіны*: выкарыстанне навукова-даследчых работ установ галіны пры фарміраванні кантынгенту навучэнцаў, складанні зместу адукацыйных праграм, падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў; цесная сувязь з рэгіёнамі, актыўнае выяўленне, сістэмнае абагульненне і распаўсюджванне перспектыўнага вопыту іх працы ў працэсе рэалізацыі адукацыйных праграм і інш.

ДАД утрымлівае значныя рэсурсы, здольныя аказаць пазітыўны ўплыў на развіццё чалавечага капіталу, павышэнне канкурэнтаздольнасці краіны. Аднак практычныя падыходы да іх выкарыстання патрабуюць кардынальнай перабудовы на аснове абагульнення перадавога і інавацыйнага вопыту, у якую ўваходзяць удасканаленне форм і метадаў адукацыйнай дзейнасці; усталяванне больш цеснай сувязі з арганізацыямі-заказчыкамі; фактычнае ўкараненне вынікаў навукова-даследчых работ у змест праграм і іх рэалізацыю; фарміраванне кампетэнтнасці самаразвіцця навучэнцаў; прымяненне метадаў комплекснай ацэнкі кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу, якія існуюць у айчыннай і міжнароднай практыцы.

1. *Галичин, В. А.* Основные характеристики и тенденции развития образования взрослых в условиях глобализации [Электронный ресурс] / В. А. Галичин // Век глобализации. – 2012. – № 1. – С. 104–114. – Режим доступа: https://www.socionauki.ru/journal/files/vg/2012_1/104-114.pdf. – Дата доступа: 22.01.2020.

2. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь до 2030 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://srrb.niks.by/info/program.pdf. – Дата доступа: 22.01.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ